наглядного сравнения с правильным расположением картинок. Сравнивая, ребёнок передавал содержание картинок в речи. Параллельно серии картинок использовались инсценировки с игрушками, в которых главные герои выполняли ряд действий (мишка и зайчик качаются на качелях; кукла Маша и ёжик строят дом; лисёнок катается на лошадке). Затем предлагались готовые игровые ситуации, созданные взрослым с помощью игрушек и фигурок на фланелеграфе.

Игровые ситуации позволяли детям овладевать навыками, необходимыми для построения связного монологического высказывания: отбирать лексический материал в соответствии с темой и ситуацией высказывания, использовать разнообразные синтаксические конструкции. Они вызывали у детей большой интерес и переносились ими в самостоятельные игры, сопровождались высокой речевой активностью.

В целях проверки, насколько они могут замечать нарушения последовательности в речи без использования наглядного материала, проводилась игра «Так бывает или нет?». Она способствовала развитию логического мышления, умения замечать непоследовательность в рассказах, устанавливать связи между явлениями и выражать их в слове.

В целях побуждения детей к созданию самостоятельных высказываний были использованы готовые ситуации. Так, воспитанникам предлагалось: «Помоги мне, пожалуйста. Я буду рассказывать свою историю (сказку), а ты показывать её». Ребёнок внимательно слушал и расставлял фигурки на фланелеграфе или игрушки. В самостоятельной деятельности дети часто использовали предлагаемые игрушки, фигурки на фланелеграфе, придумывали и разыгрывали ситуации друг перед другом (получался импровизированный театр). Вместе с тем было отмечено, что часто они скачкообразно переходили в рассказе от одной части к другой, использовали короткие предложения, однообразные связи, чаще формальную и цепную местоименную.

*На заключительном этапе* исследования учащиеся провели контрольное диагностирование в целях определения показателей сформированности связной речи у детей старшего дошкольного возраста. Анализ и обобщение результатов проделанной работы показали, что речевые умения недостаточно сформированы у 10 % воспитанников; частично сформированы у 50 %, сформированы у 40 % воспитанников.

Такой результат свидетельствует о том, что проводимая работа способствовала повышению показателей развития связной речи детей.

**Заключение.** Использование выбранных методических приёмов позволило значительно повысить показатель развития связной речи детей дошкольного возраста. Наблюдая за свободной деятельностью детей, учащиеся отметили, что возможность действовать с игрушкой позволяет ребёнку легко менять ситуацию. Это подталкивает его к поиску адекватных ситуации слов, фраз, предложений, что, в свою очередь, оказывает влияние на связность высказывания.

Анализ результатов данного исследования показал, что театральная деятельность имеет большое значение для формирования речевого развития дошкольника, для развития выразительной стороны речи.

Благодаря использованию этих приёмов, у детей повышается интерес к художественной литературе, оптимизируется процесс развития связной речи.

**Список цитированных источников**

1. *Давидович, А. Л.* Развитие речевого творчества старших дошкольников : пособие для педагогов учреждений дошк. образования / А. Л Давидович. — Минск : Нац. ин-т образования, 2011. — 123 с.
2. *Старжинская, Н. С.* Развитие речи и общения у детей дошкольного возраста : пособие для педагогов учреждений дошк. образования / Н. С. Старжинская, Д. Н. Дубинина. — Минск : Адукацыя і выхаванне, 2012. — 284 с.
3. Игра в жизни дошкольника : пособие для педагогов учреждений дошк. образования / Е. А. Панько [и др.] ; под ред. Я. Л. Коломинского, Е. А. Панько. — Минск : Нац. ин-т образования, 2012. — 231 с.

Репозиторий БарГУ

УДК 378

**Палойка Надзея Іванаўна**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Жамчужненскі яслі-сад", аг. Жамчужны, Рэспубліка Беларусь,*
*zhemch-sad@baranovichi.edu.by*

## ФАРМІРАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ Ў ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ ШЛЯХАМ ДАЛУЧЭННЯ ДА КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Артыкул асвятляе праблему далучэння дзяцей дашкольнага ўзросту да нацыянальнай культуры; раскрывае сутнасць паняцця «нацыянальная самасвядомасць», распавядае пра накірункі педагагічнай дзейнасці, формы далучэння дзяцей дашкольнага ўзросту да народнай культуры. Артыкул адрасуецца выхавальнікам дашкольнай адукацыі, студэнтам устаноў вышэйшай адукацыі.

**Ключавыя словы:** праблема; дашкольны ўзрост; нацыянальная культура; нацыянальная самасвядомасць; накірунак; форма.

© Палойка Н. І., 2020

**Poloiko Nadezhda Ivanovna**
*Zhemchuzhny Nursery-kindergarten, Zhemchuzhny, Belarus, zhemch-sad@baranovichi.edu.by*

# FORMATION OF NATIONAL CONSCIOUSNESS OF PRESCHOOL CHILDREN BY INTRODUCING THEM TO THE CULTURE OF THE BELARUSIAN PEOPLE

The article covers the problem of the inclusion of children of preschool age and national culture, and reveals the essence of the concept of national identity. The author tells about the direction of pedagogical activity, the form of participation of children of preschool age and folk culture. The article is addressed tothe teachers of preschool education, the student of higher education institutions.
**Key words:** a problem; preschool; a national culture; a national identity; a direction; a form**.**

**Уводзіны.** Для таго, каб жыць асэнсавана і з пачуццём асабістай годнасці, кожнаму чалавеку патрэбна ведаць свае вытокі, захоўваць памяць аб мінулым свайго народа, шанаваць яго традыцыі, любіць Радзіму. Сусветная грамадскасць выражае занепакоенасць падзеннем духоўнасці падрастаючага пакалення. У прадстаўнікоў розных народаў назіраецца страта духоўнай сувязі са сваёй нацыянальнай культурай, таму праблема далучэння дзяцей да нацыянальнай культуры набывае ў наш час асаблівую значнасць [1].

**Асноўная частка.** Найважнейшым накірункам педагагічнай дзейнасці з’яўляецца выхаванне ў дзяцей дашкольнага ўзросту разумення і прыняцця сваёй роднай культуры і культуры іншых народаў, фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці.

Паняцце нацыянальнай самасвядомасці ў дачыненні да дзяцей дашкольнага ўзросту разглядаецца як неад’емная частка любові да Радзімы і вызначаецца як усведамленне сваёй супольнасці з пэўным народам на аснове ўяўленняў аб яго гісторыі і культуры.

Першаснае ўсвядомленае далучэнне дзіцяці да каштоўнасцей культуры адбываецца ў перыяд маленства пры ўспрыманні інтанацыйнага боку роднай мовы. У гэтым узросце дзіця яшчэ не разумее сэнсавага значэння, якое яму хочуць данесці, форм народнай культуры, але яно адчувае вялікае задавальненне і захапленне ад сумеснага прайгравання з дарослым пацешак «Сарока-варона», «Каза рагатая» і інш. Пазітыўны эмацыянальны водгук дзіцяці на яркія вобразы народнай культуры з’яўляецца той асновай, якая ў далейшым зможа канкурыраваць з самай аб’ёмнай інфармацыяй аб навакольным свеце [2].

У раннім узросце працэс станаўлення асноў нацыянальнай самасвядомасці ўзбагачаецца за кошт дапаўнення элементаў народнай культуры: дзіця авалодвае першапачатковымі ўяўленнямі аб жыллі чалавека, аб жывёлах, якія засяляюць падвор’е, аб прасцейшых народных музычных інструментах і інш. Змястоўную аснову інфармацыі аб наваколлі складаюць народныя казкі, сугучныя са спецыфікай узроставага ўспрымання дзіцяці: прырода, людзі, жывёлы ўяўляюць адно цэлае, аднолькава апранаюцца (коцік — у капялюш, пеўнік — у боцікі і г. д.), размаўляюць на адной мове і разумеюць адзін аднаго. Дзеці добра разумеюць і эмацыянальна рэагуюць на мастацкія вобразы, адлюстраваныя ў народнай культуры [2].

Народная культура па-ранейшаму застаецца асноўнай змястоўнай формай далучэння дзяцей да навакольнага свету і ў малодшым дашкольным узросце. Узбагачэнне яе элементаў адбываецца па меры авалодання дзецьмі першапачатковымі ўяўленнямі аб структуры жылля (падлога, сцены, столь, вокны і інш.), яго ўбрання, прадметах ужытку (печка, стол, лаўка, люлька і інш.), хатніх рэчах, цацках, кухні. У гэтым узросце дзіця пад кіраўніцтвам дарослага актыўна ўключаецца ў ваджэнне карагодаў, выкананне плясак, песень, адлюстроўвае атрыманыя ўражанні ў спецыяльна арганізаваных відах дзейнасці [2].

У старшым дашкольным узросце ўяўленні дзяцей аб розных элементах народнай культуры дыферэнцыруюцца і дапаўняюцца новай інфармацыяй аб народных святах, традыцыйных відах дзейнасці. У гэтым узросце дзіця вучыцца ўстанаўліваць прасцейшыя сувязі паміж дабрабытам чалавека і яго адносінамі да працы, прыроды, людзей, выказвае жаданне да ўдзелу ў значных падзеях, адлюстроўвае свае ўяўленні аб асноўных элементах нацыянальнай культуры (адзенне, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, творчасць нацыянальных аўтараў, гульні і г. д.) не толькі ў спецыяльна арганізаванай, але і ў самастойнай дзейнасці. Асноўным дасягненнем гэтага ўзросту з’яўляецца першасная нацыянальная ідэнтыфікацыя, якая праяўляецца ва ўсвядомленым абазначэнні нацыянальнай прыналежнасці.

Калі своечасова не заахвочваць дзяцей да ўласнай нацыянальнай культуры, працэс нацыянальнай ідэнтыфікацыі як адзін з найважнейшых элементаў нацыянальнай самасвядомасці нівеліруецца, што можа прывесці ў далейшым да закамплексаванасці, праяўлення нацыянальнай ушчэрбнасці, нізкага ўзроўню сацыяльнай паспяховасці [2].

У Канцэпцыі дашкольнай адукацыі Рэспублікі Беларусь адзначаецца, што фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці — гэта праблема засваення дзецьмі роднай мовы, гісторыі, культуры. Палітыка нашай дзяржавы накіравана на адраджэнне нацыянальных традыцый і каштоўнасцей, бо толькі тое пакаленне, якое ўсведамляе сваю нацыянальную годнасць, свае карані, культуру, будзе трывалым аплотам краіны.

Пры далучэнні дзяцей дашкольнага ўзросту да народнай культуры, творчасці, гісторыі роднай краіны выкарыстоўваюцца шматлікія сродкі:

– родная мова. Менавіта з пазнання роднай мовы, з усведамлення яе як найвялікшай каштоўнасці і святыні свайго народу пачынаецца станаўленне самасвядомасці дашкольнікаў. Родная мова — гэта не

Рэпазіторый БарДУ

проста сукупнасць знакаў, а магутны сродак, з дапамогай якога дзіця далучаецца да сваіх продкаў і нашчадкаў, гэта тое, што робіць яго прыхільным да бясконцага шэрагу пакаленняў, якія жылі да яго і будуць жыць пасля яго;

– традыцыі, звычаі, абрады, святы;

– фальклор ва ўсіх яго праяўленнях (казкі, пацешкі, лічылкі і інш.);

– сродкі матэрыяльнай культуры: нацыянальная мастацкая літаратура, наглядна-ілюстрацыйны матэрыял, цацкі з выяўленымі нацыянальнымі адметнасцямі (лялькі ў нацыянальных касцюмах, цацкі — персанажы беларускіх народных казак і інш.), элементы побыту беларускага народа (люлька, посуд і інш.), прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (вышыты ручнік, выцінанкі і інш.), нацыянальнае народнае адзенне, мадэлі прадметаў нацыянальнай матэрыяльнай культуры, дыдактычны гульнёвы і навучальны матэрыял.

Эфектыўнасць выхаваўчай дзейнасці ў накірунку далучэння дзяцей да роднай мовы, гісторыі, культуры значна ўзрастае пры выкарыстанні гэтых сродкаў у разнастайных формах работы, сярод якіх варта выдзеліць пазнавальныя гутаркі ў вольнай форме, сумесную дзейнасць педагога з дзецьмі, самастойную дзіцячую дзейнасць, заняткі, гульні, тэматычныя прагулкі і экскурсіі, назіранні, святы, забавы. Пералічаныя формы работы прадугледжваюць высокую актыўнасць выхаванцаў.

Асаблівую ўвагу неабходна надзяляць такой форме работы, як народныя святы, бо яны ўяўляюць сабой найвышэйшы ўзровень развіцця духоўнай культуры, які адпавядае стану чалавека ў тым ці іншым сезоне, у тым ці іншым узросце. Прыемна, што зараз вяртаецца спрадвечная традыцыя ўдзелу дзяцей у народных святах побач з дарослымі. Гэта вельмі пазітыўны момант, таму што менавіта так стагоддзямі перадаваліся з пакалення ў пакаленне святочныя традыцыі. Дзеці з радасцю ўдзельнічаюць у народных святах, дакранаюцца да фальклору, што з’яўляецца для іх крыніцай выключнай прыгажосці і маральнага здароўя [3].

Дзякуючы сваім асаблівасцям, народныя святы даюць магчымасць здзяйсняць рознабаковае выхаванне дзяцей. Яны ствараюцца шматлікімі прысвяткамі, пастамі, падрыхтоўкай да іх фізічна, духоўна і эстэтычна. У адпаведнасці з рэгіянальным месцазнаходжаннем, якое фарміруе мясцовы мастацкі каларыт, рыхтуецца святочны матэрыял, атрыбутыка, развучваюцца песні, танцы, карагоды. У выніку стан душы дзіцяці, яго эмацыянальна-псіхалагічная сутнасць раскрываюцца насустрач святу, чакаюць і ўспрымаюць яго.

**Заключэнне.** Усім нам хочацца зазірнуць у будучае, каб убачыць нашых дзяцей шчаслівымі, разумнымі, паспяховымі людзьмі — сапраўднымі патрыётамі сваёй краіны. А для гэтага неабходна далучаць дзяцей, пачынаючы з дошкольнага ўзросту, да вытокаў народнай культуры, адраджаць пераемнасць пакаленняў, перадаваць маральныя асновы, духоўныя і мастацкія каштоўнасці. Вяртанне да каранёў, вывучэнне культуры і побыту народа садзейнічае захаванню беларускіх традыцый і звычаяў. Вусная народная творчасць у даступнай дзецям форме перадае асаблівасці беларускага характару, уласцівыя яму маральныя каштоўнасці, уяўленні пра дабро, вернасць, паважлівае стаўленне да працы, захапленне майстэрствам чалавечых рук, веру ў шчаслівае будучае. Фальклор з’яўляецца найбагацейшай крыніцай пазнавальнага і маральнага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Жалняровіч, Н. І.* Хутка ў нашай хаце свята. Знаёмім дашкольнікаў з традыцыямі беларусаў : дапам. для педагогаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашк. адукацыі / Н. І. Жалняровіч, М. А. Каліноўская. — 2-е выд. — Мазыр : Белы Вецер, 2011. — 63, [1] с. : іл. — (Серыя «Выхоўваем грамадзяніна»).
2. *Коломийченко, Л.* Концептуальные аспекты формирования основ национальной и этнической толерантности у детей дошкольного возраста / Л. Коломийченко // Дет. сад от А до Я. — 2006. — № 6.
3. *Цыральчук, А. А.* Купалінка: народныя святы і абрады : дапам. для педагогаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашк. адукацыі / А. А. Цыральчук. — Мазыр, 2007.


УДК 373


**Пикуза Татьяна Владимировна**
*Государственное учреждение образования «Дошкольный центр развития ребёнка г. Мозыря», Мозырь, Республика Беларусь, dcrr32@mail.ru*


# ФОРМИРОВАНИЕ КОНСТРУКТИВНЫХ УМЕНИЙ У ДЕТЕЙ СТАРШЕГО ДОШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА ПОСРЕДСТВОМ ТЕХНИЧЕСКОГО КОНСТРУИРОВАНИЯ


В статье представлен опыт работы педагога по формированию конструктивных умений у детей старшего дошкольного возраста в процессе занятий техническим конструированием. Сформированные конструктивные умения обеспечивают воспитанникам социальную успешность, развитие общих и специальных способностей к разным видам деятельности и творчеству, готовность к успешному переходу на следующий уровень образования.


**Ключевые слова:** конструктивные умения; техническое конструирование.

© Пикуза Т. В., 2020



Репозиторий БарГУ